1-15/410-УК 21.02.2024

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
_________В.А.Малашка
___________2023 г.

ПЛАН
культурных мерапрыемстваў на 2024 год у рамках правядзення рэспубліканскай акцыі «Культурная сталіца – 2024» у г.Бялынічы Магілёўскай вобласці

| № п/п | Мерапрыемствы | Тэрміны выканання | Адказныя выканаўцы |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **1. Інфармацыйнае забеспячэнне акцыі «Культурная сталіца года»** | | | |
| 1. | Асвятленне хода рэалізацыі мерапрыемстваў плана ў сродках масавай інфармацыі, стварэнне тэматычных рубрык, старонак, цыклаў артыкулаў, прысвечаных пытанням культуры | на працягу года | галоўнае упраўленне ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама (далей – галоўнае ўпраўленне), Бялыніцкі райвыканкам |
| 2. | Арганізацыя сустрэч з удзелам дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, дэпутатаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, работнікаў устаноў культуры, адукацыі, ветэранаў вайны і працы, Ганаровых грамадзян г.Бялынічы з мэтай фарміравання стаўлення да нацыянальнай культуры | на працягу года | Бялыніцкі райвыканкам, галоўнае ўпраўленне, упраўленне культуры Магілёўскага аблвыканкама (далей – упраўленне культуры) |
| 3. | Размяшчэнне вонкавай рэкламы на тэму «Культурная сталіца года» | на працягу года | дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Бялыніцкага раёна» (далей – ЦКС), гаррайвыканкамы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. | Размяшчэнне на сайтах гаррайвыканкамаў, рэгіянальных СМІ матэрыялаў «Культурная сталіца года» | на працягу года | галоўнае ўпраўленне, Бялыніцкі райвыканкам |
| **2. Мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне культурнага светапогляду і маральных каштоўнасцей, павышэнне культуры здаровага ладу жыцця, побыту і чалавечых адносін** | | | |
| 5. | Правядзенне дабрачыннай навагодняй акцыі «Нашы дзеці» | снежань 2023 – студзень 2024 | Бялыніцкі райвыканкам, установы адукацыі раёна |
| 6. | Раённы конкурс «Міс Бялынічы» | сакавік | ЦКС, установы адукацыі, арганізацыі і прадпрыемствы раёна |
| 7. | Гала-канцэрт пераможцаў абласнога агляду-конкурсу «Не старэюць душой ветэраны» | сакавік | установа культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы» (далей – метадычны цэнтр) |
| 8. | Мерапрыемствы ў рамках Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму «M.@rt.кантакт» | сакавік | установа культуры «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Магілёўскі абласны драматычны тэатр», Бялыніцкі райвыканкам |
| 9. | Раённы фестываль аматарскай мастацкай творчасці «Палітра Бялыніцкага краю» | красавік-май | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 10. | Рэгіянальны конкурс рэтра-песні «Залатая мелодыя» | красавік-май | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 11. | Выстава, прысвечаная дню здароўя «Мы гаворым здароўю «ТАК!» | красавік | філіял «Мастацкі музей В.К.Бялыніцкага-Бірулі ў г.Бялынічы» ўстановы культуры «Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В.Масленікава» (далей – музей) |
| 12. | Рэгіянальны конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці «Крынічкі» | май-чэрвень | ЦКС, метадычны цэнтр |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 13. | Рэгіянальны пленэр юных мастакоў «Сэрцу мілая старонка» | чэрвень | дзяржаўная ўстанова адукацыі «Бялыніцкая дзіцячая школа мастацтваў» (далей – ДШМ), УА «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| 14. | Раённы велапрабег «Экалагічны лад жыцця» | чэрвень | сектар спорту і турызму Бялыніцкага райвыканкама, установы адукацыі, арганізацыі і прадпрыемствы раёна |
| 15. | Раённы конкурс сярод маладых сем'яў «Я+Я=Маладая сям'я» | жнівень | ЦКС, Бялыніцкая раённая арганізацыя грамадскага аб'яднання «БРСМ» |
| 16. | Пастаноўкі аматарскіх тэатральных калектываў «Тэатральны тыдзень» | верасень | метадычны цэнтр |
| 17. | Мерапрыемствы ў рамках Міжнароднага пленэру па жывапісу «Образ Родины в изобразительном искусстве» | верасень-кастрычнік | установа культуры «Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В.Масленікава» (далей – абласны мастацкі музей), Бялыніцкі райвыканкам |
| 18. | Мерапрыемствы ў рамках Міжнароднага фестывалю анімацыйных фільмаў «Анимаевка» | кастрычнік | Магілёўскае абласное вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Кінавідэапракат», Бялыніцкі райвыканкам |
| 19. | Раённы агляд-конкурс творчых калектываў і выканаўцаў сярод арганізацый і прадпрыемстваў раёна «Таленты сярод вас» | кастрычнік-лістапад | Бялыніцкі райвыканкам, арганізацыі і прадпрыемствы раёна, ЦКС, метадычны цэнтр |
| 20. | Раённы фестываль тэатральнай творчасці «Бялыніцкая тэатральная восень» | кастрычнік-лістапад | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 21. | Правядзенне акцыі па добраўпарадкаванні горада «Чысты горад – чыстае сумленне» | на працягу года | Бялыніцкі райвыканкам, арганізацыі і прадпрыемствы раёна |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3. Мерапрыемствы, накіраваныя на выхаванне патрыятычнай самасвядомасці грамадзян, папулярызацыю беларускай мовы і культуры** | | | |
| 22. | Творчыя сустрэчы, літаратурныя гасцёўні, выставы, вечары-вандраванні па біяграфіях землякоў | на працягу года | установы адукацыі і культуры Бялыніцкага раёна |
| 23. | Цыкл творчых сустрэч з гісторыкамі, краязнаўцамі, пісьменнікамі.<br>Літаратурная гасцёўня «Маёй сілы крыніца – родны край» (сустрэча з пісьменніцай С.Магілеўчык).<br>Краязнаўчы калейдаскоп «У добрага празаіка вострае пяро» – да юбілею В.Найдзіна.<br>Урок краязнаўства «Поэт светлого слова Виктор Ховратович».<br>Літаратурны экскурс «Пакуль душу наведвае натхненне…» да юбілею З.Марозава | на працягу года | дзяржаўная ўстанова культуры «Бялыніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сетка» (далей – ЦБС), установа культуры «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» (далей – абласная бібліятэка) |
| 24. | Рэалізацыя мерапрыемстваў рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Я – грамадзянін Беларусі!», рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі, тым ганаруся» | на працягу года | Бялыніцкі райвыканкам, Бялыніцкая раённая арганізацыя грамадскага аб'яднання «БРСМ», установы адукацыі раёна |
| 25. | Правядзенне тэматычных мерапрыемстваў, прымеркаваных да Міжнароднага дня роднай мовы, ва ўстановах культуры і адукацыі раёна | на працягу года | сектар культуры, аддзел па адукацыі Бялыніцкага райвыканкама |
| 26. | Акцыя «Размаўляй па-беларуску».<br>Медыягутарка «Слаўлю цябе, мая родная мова!».<br>Відэаўрок «Гучы, родная мова».<br>Гадзіна духоўнасці «Родная мова – крыніца думак і пачуццяў» | на працягу года | ЦБС, абласная бібліятэка |
| 27. | Адкрыццё акцыі «Культурная сталіца года» | люты | Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленне культуры, Бялыніцкі райвыканкам, ЦКС |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 28. | Мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю беларускай літаратуры і чытання ў сучасным грамадстве («Лета з добрай кнігай»).<br>Дзень сямейнага адпачынку «Чытанне як фактар сацыяльнага поспеху».<br>Літаратурная імпрэза «Калі вам даспадобы беларускія аўтары..».<br>Сямейная гадзіна ў бібліятэцы «Разам весела чытаць».<br>Сямейны вечар «Ад сям'і сцяжынка да роду і народу» | на працягу года | ЦБС, абласная бібліятэка |
| 29. | Правядзенне мерапрыемстваў, прымеркаваных да святкавання Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Дня яднання народаў Беларусі і Расіі, Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, Дня усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дня народнага адзінства | сакавік, май, ліпень, верасень | Бялыніцкі райвыканкам, арганізацыі і прадпрыемствы раёна, Бялыніцкая раённая арганізацыя грамадскага аб'яднання «БРСМ» |
| 30. | Вусны часопіс «Знакамітыя беларусы ў Расіі».<br>Гістарычныя віражы «Беларусь і Расія: два народа – адна сям'я».<br>Урок гісторыі «Калі мы адзіныя – мы непераможныя».<br>Гутарка «Беларусь і Расія – адзіная воля братэрскіх randаў».<br>Гадзіна інфармацыі «Саюз Беларусі і Расіі: гісторыя даўжынёю ў стагоддзі» | красавік | ЦБС, абласная бібліятэка |
| 31. | Удзел у рэспубліканскім патрыятычным праекце «Кветкі Вялікай Перамогі» | май | сектар культуры Бялыніцкага райвыканкама |
| 32. | Бібліятэчная пляцоўка «Хай будзе ясным неба над зямлей!».<br>Мітынг «Прыйшла вясна – вясна Перамогі».<br>Мультымедыйны кнігаагляд «Дарагая сэрцу кніга пра вайну».<br>Дзень мужнасці і гераізму «Есць памяць, якой не будзе забыцця і слава, якой не будзе канца».<br>Краязнаўчая старонка «Гартаючы летапіс вайны» | май | ЦБС, абласная бібліятэка |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 33. | Рэгіянальны конкурс выканаўцаў патрыятычнай і маладзёжнай песні, прысвечаны памяці Героя Савецкага Саюза Л.Лорчанкі | чэрвень | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 34. | Мерапрыемствы, прысвечаныя Дню моладзі і студэнцтва | чэрвень | ЦКС, установы адукацыі, арганізацыі і прадпрыемствы раёна |
| 35. | Свята кнігі і мовы «Вытокі беларускага пісьменства».<br>Бібліятэчны ўрок «Каля крыніцы беларускай кнігі».<br>Кнігападарожжа «Кто знает АЗ да БУКИ, тому и книги в руки».<br>Гістарычнае падарожжа «Светачы беларускай зямлі» | верасень | ЦБС, абласная бібліятэка |
| 36. | Канцэрт пераможцаў праекта «Беларусь родная, музычная, народная» | жнівень | метадычны цэнтр |
| 37. | Маладзёжны патрыятычны праект «Песня роднай зямлі», па матывах паэм А.Казека | на працягу года | установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| **4. Мерапрыемствы, накіраваныя на развіццё і падтрымку нацыянальных духоўных і культурных традыцый** | | | |
| 38. | Абласны семінар дырэктараў бібліятэчных сетак Магілёўскай вобласці на базе ДУК «Бялыніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сетка» | сакавік | абласная бібліятэка |
| 39. | Свята бярозавага соку «Жывая крыніца Цяхцінскіх бяроз» | май | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 40. | Рэгіянальны фестываль традыцыйнай кухні «Традыцыйная кухня Падняпроўя» | чэрвень | метадычны цэнтр |
| 41. | Свята гармоніка «Грай и спявай, гармонік любы!» | ліпень | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 42. | Фестываль народнай творчасці «Ільняныя крылы – ручнікі» | жнівень | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 43. | Рэгіянальны конкурс гарманістаў і выканаўцаў прыпеўкі «Прыдняпроўскі гармонік» | жнівень | метадычны цэнтр |
| 44. | Капустны фэст «Спадарыня Капуста» | верасень | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 45. | Бліна-фэст «Бліны з навіны» | верасень | ЦКС, метадычны цэнтр |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 46. | Этнаграфічныя экспедыцыі ў вёскі Бялыніцкага раёна з мэтай папаўнення фондаў прадметамі сельскага побыту і збору нематэрыяльнай спадчыны | на працягу года | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 47. | Святы і абрады народнага каляндара | на працягу года | ЦКС, метадычны цэнтр |
| 48. | Духоўна-асветніцкі праект «Разам з кнігай па дарозе да храма» | на працягу года | ЦБС, абласная бібліятэка |
| 49. | Кінаакцыя «Творы беларускіх пісьменнікаў у кінематографе» | на працягу года | ЦБС, абласная бібліятэка |
| 50. | Выстава-прэзентацыя краязнаўчых інтэрнет-рэсурсаў публічных бібліятэк Магілёўскай вобласці «Малая радзіма ў віртуальнай прасторы» ў ДУК «Бялыніцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сетка» | на працягу года | абласная бібліятэка |
| 51. | Правядзенне творчых сустрэч і майстар-класаў з выкладчыкамі і навучэнцамі дзіцячых школ мастацтваў, а таксама работнікамі сферы культуры па па розных напрамках | на працягу года | упраўленне культуры |
| 52. | Пасяджэнне па супрацоўніцтве ўстаноў культуры і Беларускай Праваслаўнай Царквы. Прэзентацыя рэлігійнага маршруту Бялыніцкага раёна | на працягу года | галоўнае ўпраўленне, Бялыніцкі райвыканкам |
| 53. | Круглы стол з наведваннем аб'ектаў культурна-пазнавальнага турызму для тураператараў | на працягу года | галоўнае ўпраўленне, Бялыніцкі райвыканкам |
| 54. | Прэс-тур па Магілёўскай вобласці. Пленарнае пасяджэнне ў Бялыніцкім раёне | на працягу года | галоўнае ўпраўленне, Бялыніцкі райвыканкам |
| 55. | Пленэр мастакоў з правядзеннем майстар-класаў | на працягу года | Бялыніцкі райвыканкам, сектар культуры Бялыніцкага райвыканкама, установа культуры «Магілёўскі абласны мастацкі музей ім. П.У. Масленікава» |
| **5. Мерапрыемствы, накіраваныя на развіццё і падтрымку прафесійнага беларускага мастацтва** | | | |
| 56. | Цыкл персанальных выстаў «Наша спадчына» | на працягу года | ЦКС, метадычны цэнтр |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 57. | Выступленні прафесійных калектываў і выканаўцаў Рэспублікі Беларусь | на працягу года | ЦКС |
| 58. | Акцыя «Напішы мне», прымеркаваная да Дня ручнога ліста | 23 студзеня | музей |
| 59. | Выстава, прымеркаваная да 110-годдзя з дня нараджэння П.В.Масленікава, з фондаў абласнога мастацкага музея | люты | музей |
| 60. | Выстава «Гадзіна цішыні» сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем і музеем-дачай «Чайка» (Расійская Федэрацыя) | сакавік | музей |
| 61. | Канцэрт арганнай музыкі з удзелам УА «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў», прымеркаваны да Дня святкавання абраза Бялыніцкай Божай Маці | красавік | музей, УА «Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| 62. | Патрыятычны праект «Мы памятаем», прымеркаваны да Дня Перамогі | май | музей |
| 63. | Дзень адчыненых дзвярэй «Погляд знутры», прымеркаваны да Дня музеяў | май | музей |
| 64. | Ноч музеяў – 2024 | май | музей |
| 65. | Кінатэатр пад адкрытым небам «Золата айчыннага кінематографа» (тэрыторыя гарадской пляцоўкі побач з музеем) | чэрвень | музей |
| 66. | Рэспубліканскі кінафестываль «Киновек» (паказ лепшых фільмаў беларускай вытворчасці з выступамі кінематаграфістаў, кіназнаўцаў, гісторыкаў кіно) | 28 лютага – 11 снежня | Магілёўскае абласное вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Кінавідэапракат», ЦКС |
| 67. | Арт-майстэрня з Л.У.Журавовіч. Цыкл лекцый з майстар-класамі | ліпень | музей |
| 68. | Выстава народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Праз пакаленні» | верасень | музей, ЦКС |
| 69. | Абласны семінар рэжысёраў масавых святаў | верасень | метадычны цэнтр |
| 70. | Майстар-клас ад І.А.Бархаткова «Як у Бірулі» | кастрычнік | музей |
| 71. | Навуковая канферэнцыя «Захаваная спадчына» сумесна з абласным мастацкім музеем, УА «Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова» | лістапад | музей |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 72. | Выстава з фондавай калекцыі музея | кастрычнік | музей |
| 73. | Выставы з фондавай калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея | на працягу года | УК «Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е.Р. Раманава», Нацыянальны гістарычны музей, музей |
| 74. | Арганізацыя і правядзенне экскурсій па турыстычным маршруце «Край белых начэй» | на працягу года | музей |
| 75. | Тэматычныя музейныя заняткі | на працягу года | Музей |
| **6. Мерапрыемствы, накіраваныя на забеспячэнне роўнага доступу грамадзян Рэспублікі Беларусь да культурных даброт** | | | |
| 76. | Культурная акцыя «Мы дорым сваю творчасць працаўнікам сяла». Выязныя канцэрты вядучых калектываў горада ў аграгарадках | на працягу года | ЦКС |
| 77. | Абменныя канцэрты творчых калектываў г.Бялынічы і горадоў-пабрацімаў «Мы – пабрацімы!» | на працягу года | ЦКС |
| 78. | Кнігасвята, прымеркаванае да Дня беларускай пісьменнасці з удзелам прадстаўнікоў ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» | верасень | ЦКС |
| 79. | Майстар-клас «Стварэнне вобраза ў анімацыі» ўдзельнікаў Міжнароднага фестывалю анімацыйных фільмаў «Анимаевка» | кастрычнік | ЦКС |
| 80. | Творчая сустрэча з акцёрамі і рэжысёрамі УП «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», прымеркаваная да Дня беларускага кіно | снежань | Магілёўскае абласное вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Кінавідэапракат», ЦКС |
| **7. Мерапрыемствы па ахове і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа** | | | |
| 81. | Абласны семінар-практыкум «Актуальныя пытанні аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны» | красавік | метадычны цэнтр |
| 82. | Цыкл мерапрыемстваў па ахове і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа | на працягу года | сектар культуры, аддзел па адукацыі Бялыніцкага райвыканкама |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 83. | Удзел ў правядзенні сацыялагічных даследаванняў па пытаннях культуры, мастацкай літаратуры і чытання | на працягу года | сектар культуры Бялыніцкага райвыканкама |
| 84. | Правядзенне культурных мерапрыемстваў сумесна з рэспубліканскімі, абласнымі ўстановамі культуры, падпарадкаванымі Міністэрству культуры (выставы, імпрэзы, святы і іншае) | на працягу года | сектар культуры Бялыніцкага райвыканкама, рэспубліканскія, абласныя ўстановы культуры |

Старшыня
Бялыніцкага раённага
выканаўчага камітэта — В.В.Прыстромская

Начальнік
упраўлення культуры
Магілёўскага аблвыканкама — А.М.Жыгун